**Маніторынг гістарычнай палітыкі**

**(люты – красавік 2022)**

**Аляксей Ластоўскі**

У разгляданы перыяд адбылася адна важная падзея ў рэгіёне, якая непасрэдна паўплывала і на міжнародныя станункі, і на ўнутраную грамадска-палітычную сітуацыю ў Беларусі – пачатак расійскай вайсковай агрэсіі ва Украіне. Беларускія ўлады занялі падвойную пазіцыю. З аднаго боку, тэрыторыя Беларусі выкарыстоўвалася расійскімі войскамі як плацдарм, адсюль перакідваліся войскі ў наступ на Кіев, адсюль ляцелі ракеты для абстрэлу ўкраінскай тэрыторыі, мясцовыя шпіталі скарыстоўваліся для лекавання расійскіх вайскоўцаў. Усё гэта прывяло да міжнароднага асуджэння Беларусі як краіны-агрэсара. Але разам з тым, беларускія вайскоўцы не прынялі непасрэднага ўдзелу ў баявых дзеяннях на тэрыторыі Украіны, а сам Лукашэнка таксама спрабаваў гуляць у звыклай для яго міратворчай пазіцыі, праўда, без асаблівых поспехаў. Фактар вайсковай агрэсіі Расіі не мог не паўплываць на гістарычную палітыку ўнутры Беларусі, што мы і разгледзім.

У цэлым міжнароднае напружанне напярэдадні расійскай агрэсіі і пасля яе пачатку не магло не адбіцца на агульным курсе гістарычнай палітыкі, шалёны тэмп навінаў і агульная ўвага да падзей ва Украіне паспрыяла таму, што інтэнсіўнасць гістарычнай тэматыкі ў беларускіх медыях (як дзяржаўных, так і недзяржаўных) у лютым 2022 года рэзка заняпала. Так, у аналіз за люты патрапіла толькі 19 публікацый (для параўнання – у студзені 59 публікацый). Паводле узятай завядзёнкі раскручвалася тэма генацыду беларускага народа, паколькі ў студзені быў прыняты адпаведны закон, але відавочна, што ўвага аўдыторыі была засяроджана на зусім іншых тэмах.

Пры гэтым трэба адзначыць, што гістарычная тэматыка згуляла заўважную ролю для спробаў легітымацыі расійскай вайсковай агрэсіі. Па-першае, выкарыстоўвалася ідэя пра “штучнасць” украінскай дзяржаўнасці, вызначальнай ролі савецкай нацыянальнай палітыкі ў фармаванні тэратытарыяльнага кшталту Украіны, і ў такой перспектыве Расія (як пераемнік Савецкага Саюза) выступала ў якасці апекуна і фундатара украінскай дзяржавы. Тады актуальны стан успрымаецца як скажэнне сапраўдных стасункаў, і роля Расіі ў ходзе “вайсковай аперацыі” зводзіцца да нармалізацыі, вяртання Украіны да ўдзячнага падпарадкавання. Але трэба заўважыць, што такая рытарычная лінія не магла быць успрынятай у Беларусі без засцярогаў, паколькі такія ж аргументы маглі быць перанесенымі на беларускі кейс, і беларускую дзяржаўнасць не ў меншай ступені можна было б рэпрэзэнтаваць як вынік савецкай нацыянальнай палітыкі. Відавочна, што гэта вяло б значнага большай ступені сімвалічнага падпарадкавання Беларусі ў дачыненні да Расіі, чым гэта хацелася б Лукашэнку. Таму гэта лінія практычна адсутнічала ў павестцы беларускіх дзяржаўных медый, у адрозненне ад Расіі.

Іншая лінія гістарычнай легітымацыі для расійскай вайсковай агрэсіі – гэта так званая “дэнацыфікацыя”. У такім ракурсе Расія зноў жа займае ролю поўнага пераемніка Савецкага Саюза, галоўным дасягненнем якога ў расійскай гістарычнай палітыцы лічыцца перамога над германскім нацызмам. Тады, адпаведна, гістарычнай і культурнай місіяй Расіі з’яўляецца ахова памяці пра перамогу ў Вялікай Айчыннай вайне і недапушчэнне адраджэння нацызму ў іншых краінах. Безумоўна, што такі наратыў базуецца на максімальным спрашчэнні гісторыі часу Другой сусветнай вайны, разгляду яго ў чорна-

белай прызме (змагання Дабра са Злом), але вядзе і да небяспечных наступстваў, калі Расія атрымлівае маральнае права для ажыццяўлення аперацый “дэнацыфікацыі”. З аднаго боку, гэта кладзецца ўжо на ўсталяваную парадыгму беларускай гістарычнай палітыкі, з атаясамленнем Рэспублікі Беларусь з перамогай савецкай арміі, і асаблівай увагай да ўдзелу нацыяналістычных фармаванняў у “генацыдзе беларускага народу”. Яшчэ раней з’яўляліся рэгулярна матэрыялы пра “зверствы”, жахлівыя злачынствы ўкраінскіх нацыяналістычных фармаванняў падчас нацысцкай акупацыі Беларусі (прытым не без ўдзелу расійскіх пасярэднікаў, хоць бы нагадаем, што зборнік дакументаў “*Убийцы Хатыни*” пад рэдакцыяй Аляксандра Дзюкава атрымаў маніпулятыўны падзагаловак “*118-й украинский батальон охранной полиции*”, пры гэтым да назвы шматэтнічнага батальёна рэдактарам было дададзена вызначэнне “украінскага”).

Гэта блізкая беларускім прапагандыстам тэма не магла застацца без увагі. Асабліва шчыруе на гэтым полі Вадзім Гігін, свежапрызначаны старшыня таварыства “Веды”. Ужо 24 лютага ў эфіры “Альфа радыё” ён непасрэдна звязаў вайну ў Украіне з гістарычнай палітыкай: “*Тот коллапс государственности, который мы наблюдаем в Украине, во многом вызван безответственным отношением к истории. Фальсификации, переписывания [фактов] – можно о многом говорить”*[1]. Надалей, Гігін узяўся шчыльна распрацоўваць украінскую тэматыку з дапамогай ужо знаёмага нам тропа “злачынстваў украінскіх нацыяналістаў”, асабліва з дапамогай аўтарскай youtube-перадачы “*Историческая среда*”, дзе адразу ж украінская тэма стала прыярытэтнай. Ужо 3 сакавіка была выпушчана перадача “Украінскі нацыяналізм на тэрыторыі Беларусі”, дзе дадатковая ўвага была нададзена тэрытарыяльным прэтэнзіям на Палессе ўкраінскіх нацыяналістаў, а сама іх ідэалогія была імпліцытна названая “фашысцкай”. Наступная перадача 9 сакавіка фактычна была працягам расповяду пра дзейнасць украінскіх нацыяналістаў, з адмысловым акцэнтам на “зверствах”, прычым датычна польскага насельніцтва падчас “Валынскай разні”. У прапагандысцкай падачы многія праблемныя пытанні пры гэтым здымаліся, найперш, наколькі быў масавым удзел мясцовага ўдзельніцтва беларускага Палесся ва ўкраінскіх фармаваннях. Яшчэ адна перадача з гэтага цыклу Вадзіма Гігіна таксама была прысвечана гістарычным аналогіям актуальнай вайны, дзе злачынствы расійскага войска ў Бучы аб’яўляліся “правакацыяй” па аналогіі з нацысцкімі абвінавачваннямі саветаў у злачынствах у Немерсдорфе. Зноў жа, бачым працоўную аналогію, калі расійская армія атаясамляецца цалкам з савецкай арміяй часоў Вялікай Айчыннай вайны, а пазіцыя ўкраінскага боку фактычна супадае з нацысцкай. Украінскія нацыяналісты абвінавачваюцца ў выкарыстанні тэрарыстычных метадаў барацьбы, што дае Гігіну падставы залічваць ідэалогію ўкраінскага інтэгральнага нацыяналізму ў лік фашысцкіх, а сучасныя ўкраінскія ўлады ў такой перспектыве адраджаюць гэтую фашысцкую ідэалогію – і гэтыя метады барацьбы[2]. Пры гэтым менавіта апеляцыя да “ачарнення памяці пра Перамогу” служыць ледзь не галоўным аргументам для расійскага ўварвання ў Украіну: “*В свое время жители соседней Украины принесли огромную жертву для победы над фашизмом. И когда мы видим, как память о Великой Отечественной войне оплевывают, растаптывают и уничтожают, мириться с этим невозможно. И этот лозунг денацификации приобретает актуальность как никогда ранее*”[3] (30.04.2022).

---

[1] https://www.sb.by/articles/gigin-kollaps-gosudarstvennosti-v-ukraine-vyzvan-bezotvetstvennym-otnosheniem-k-istorii.html
[2] https://www.sb.by/articles/ideologiya-terrora.html
[3] https://polese.by/novosti/god-istoricheskoj-pamjati/gigin-nacija-raskryvaetsja-v-tot-period-kogda-otvechaet-na-tu-ili-inuju-ugrozu/

Пры гэтым важна адзначыць, што як ні дзіўна, нават саўдзел Беларусі ў расійскай агрэсіі супраць Украіны не прывёў да нейкага значнага ўзрастання апеляцый да гістарычных злачынстваў украінскіх нацыяналістаў, апроч вышэйзгаданага зацікаўлення гэтай тэматыкай з боку Вадзіма Гігіна. Нейкага чаканага шквалу публікацый пра украінцаў як спрадвечных “нацыстаў” (што адбылося ў расійскай медыя-прасторы) у беларускіх дзяржаўных СМІ не адбылося.  Больш за тое, істотна знізіўся доступ да публічных дзяржаўных пляцовак так званых “ястрабаў вайны” (Аляксей Дзермант, Мікалай Шчокін), якія выступаюць за паўнамасштабную вайсковую мабілізацыю, выкарыстанне ўсіх рэсурсаў (у тым ліку, ядзернай зброі), каб давесці вайну да “пераможнага завяршэння”. Для згаданых асобаў у публічнай прасторы засталася ніша пазітыўнай інтэрпрэтацыі словаў Лукашэнкі ды традыцыйнае аблайванне гнілога Захада, але рыторыка вайсковай мабілізацыі была прыбрана з беларускіх дзяржаўных СМІ.

Пры гэтым сама колькасць публікацый на гістарычную тэматыку, якая на некаторы час (люты – першая палова сакавіка 2022) знізілася, паступова аднавілася. У дадзеным выпадку можна казаць пра чарговую медыя-кампанію, якая была засяроджана на падрыхтоўцы да Дня Перамогі (9 мая). Не зважаючы на тое, што гэты год не з’яўляецца круглым і параду не планавалася (беларускія ўлады для камемарацыі Дня Перамогі выкарыстоўваюць цыкл у 5 гадоў і, адпаведна, апошні парад быў у 2020 годзе), але менавіта падрыхтоўка на ўзроўні сканструіраваных публічных кампаній і медыя-падтрымкі была значна большай, чым у звычайныя гады. Тут можна заўважыць і ўплыў вайны ў Украіне, хай сабе і ў спецыфічным ракурсе.

Дамінуючай дыскурсіўнай тэмай гэтай медыя-кампаніі стала “перапісванне гісторыі”, пад гісторыяй у дадзеным выпадку разумеецца выключна перыяд Другой сусветнай вайны, а галоўным аб’ектам “перапісвання” становіцца “подзвіг савецкага народа ў перамозе над нацызмам”. Адпаведна, любыя згадкі пра супрацу савецкага і нацысцкага рэжымаў у 1939 годзе, любая крытыка дзеянняў савецкіх военачальнікаў, салдатаў ці партызан, нават падкрэсліванне ролі саюзнікаў у вайсковых дзеяннях супраць нацыстаў становіцца “фальсіфікацыяй гісторыі”. А пад гэтым беларускія дзяржаўныя прапагандысты заўжды маюць на ўвазе канечную мэту ў “рэабілітацыі нацызма”. Асабліва востра быў успрыняты новы этап дэкамунізацыі культурнага ландшафту Цэнтральна-Усходняй Еўропы, дзе асноўны фокус прыпаў на помнікі Савецкай арміі, які, за рэдкімі выключэннямі, заставаліся недакатыкальнымі ў папярэднія фазы посткамуністычнага развіцця краін рэгіёну. Перамяшчэнне альбо ліквідацыя гэтых помнікаў, якія ў першую чаргу былі справакаваныя рэзкім ростам антырасійскіх настрояў пасля пачатку вайны ў Украіне, таксама сталі добрай нагодай для заклікаў да “дэнацыфікацыі” еўрапейскіх краін.

Але ў дадзеным выпадку самае цікавае, што галоўным аб’ектам для крытычных стрэлаў беларускай дзяржаўнай прапаганды становіцца менавіта “калектыўны Захад”, у значна меншай ступені – Украіна. Разам з тым, беларускае інфармацыйнае поле застаецца цалкам адкрытым для ўздзеянняў расійскіх медыя, таму расійская прапаганда пакідае тут свой след.

Пачатак расійскай агрэсіі ва Украіне таксама падштурхнуў і беларускія недзяржаўныя медыі да больш сістэматычнай працы з гістарычнай тэматыкай, паколькі мы раней заўважалі спарадычнасць і рэактыўнасць такіх зваротаў. Так, пачаткам вайны безумоўна быў інспіраваны новы праект тэлеканала “Белсат” пад назвай “Вольныя людзі Украіны”, запушчаны 11 сакавіка, ініцыятарам і аўтарам праграмы з’яўляецца гісторык Цімох Акудовіч. Сфармуляваная задача пазнаёміць беларусаў з асноўнымі падзеямі ды

асобамі ўкраінскай гісторыі мае непасрэдную повязь з сучаснасцю, дэманастрацыя гістарычных сувязей, супольнасці гістарычных лёсаў і нацыянальна-культурных адметнасцей мусіць па задумцы аўтараў стаць моцным падмуркам для супрацьстаяння антыукраінскай прапагандзе (і ў нейкай ступені дапамагчы аднаўленню беларуска-украінскіх сувязей).

Генеральная пракуратура Рэспублікі Беларусь працягвала рапрацоўку тэмы генацыду беларускага народа (пры гэтым ад карыстання гэтай тэмы былі адціснутыя ўсе патэнцыйныя канкурэнты). Распрацоўка гэтай тэмы мае колькасныя паказчыкі, паводле рапартаў за год былі апытаныя больш за 13500 сведкаў, былі выяўленыя больш за 78 новых населеных пунктаў, спаленых падчас нацысцкай акупацыі. Адной з асноўных задач было абгрунтаванне значна большых ахвяраў насельніцтва Беларусі, чым гэта было агульнапрынята раней. Якім чынам у гэтым плане працуе Генеральная пракуратура яскрава дэманструе кейс з месцам знішчэння Трасцянец непадалёк ад Мінска. У апошнія гады гісторыя гэтага месца ў сувязі з яго актуальнай мемарыялізацыяй досыць добра была даследаванай, вынікам сталі даследчыя праекты і падрыхтоўка "Гістарычнай майстэрняй" грунтоўнай выставы, якая паказвалася на самых розных пляцоўках, ад Музея Вялікай Айчыннай вайны да музеяў Аўстрыі і Германіі. Але і тут Генеральная пракуратура здолела зрабіць "навуковае адкрыццё", з дакументаў першай савецкай камісіі, якая даследавала нацысцкія вайсковыя злачынствы адразу пасля вызвалення Мінска ўлетку 1944 года. Вынікам працы камісія стала лічба ў 560 тысячаў ахвяраў, што безумоўна выглядалася важкім аргументам у абвінавачваннях нацыстаў. Пры тым метадалогія падлікаў была настолькі слабою, што практычна адразу ж савецкімі ўладамі была створана наступная камісія, задачай якой было задакументаваць масштаб ахвяраў, і наступны падлік даў лічбу 206500 ахвяраў, і гэта лічба стала афіцыйнай да нядаўняга часу (дадамо, што нямецкія гісторыкі ацэньваюць лічбу ахвяраў Трасцянца як значна ніжэйшую і за гэтыя падлікі). Вынікам жа працы Генеральнай пракуратуры стала не нейкае новае даследаванне гэтага месца калектыўнага знішчэння, а "адкрыццё" дакументаў першай камісіі, якія былі апублікаваныя ў зборніках і добра вядомыя гісторыкам. Такая метадалогія дазваляе накручваць лічбы ахвяраў падчас нацысцкай акупацыі, але паўстае заканамернае пытанне: наколькі маральна скарыстоўваць безкрытычную працу з крыніцамі, і ці ў гэтым заключаецца павага да памяці загінуўшых падчас вайны? Ясна, што падобны падыход ставіць крыж на агучаным раней плане правесці масштабную навуковую канферэнцыю з прыцягненнем даследчыкаў з іншых краін, што планавалася зрабіць увесну 2021 года, гэта прапанова неяк незаўважна знікла з публічнай павесткі.

Але вынікі сваёй працы Генеральная пракуратурая папулярызуе праз даступныя каналы, адмыслова ў галоўным дзяржаўным выданні "Беларусь сегодня" быў створаны медыя-праект для папулярызацыі "вывучэння" тэмы генацыду беларускага генацыду, які курыруе адна з самых скандальна вядомых журналістак Беларусі Людміла Гладкая. Таксама ўсе дзяржаўныя музеі Беларусі (не толькі гістарычныя, але і мастацкія) абавязалі правесці тэматычныя выставы пра генацыд беларускага народа, дзе ў якасці агульнага тэксту для ўсіх выстаў Генеральная пракуратура падала свае высновы, дзе зноў жа фігуруе лічба ў 560 тысяч ахвяраў нацыстаў у Трасцянцы.

І ўрэшце пад рэдакцыяй генеральнага пракурора Андрэя Шведа была выпушчана кніга пад прадказальнай назвай "Геноцид белорусского народа", дзе апроч нацысцкай палітыкі знішчэння адмысловая ўвага надаецца дзейнасці тут украінскіх і літоўскіх паліцэйскіх батальёнаў, а таксама Арміі Краёвай (зноў жа, у тыповай безкрытычнай і

прапагандысцкай манеры). Скарыстаны метадалагічны падыход дэманструе і рэпрэзентацыя тэмы калабарацыянізму, дзе расповяд пра створаныя падчас нацысцкай акупацыі калабарацыяніcцкія структуры без усялякай лагічнай разбіўкі пераходзіць да "экстремісцкай" дзейнасці падчас палітычных пратэстаў 2020 года: "*Использование кем-либо бело-красно-белого флага и герба «Погоня» являлось прямым указанием на принадлежность человека к коллаборационистским формированиям. В 2020 году Республика Беларусь вновь столкнулась с проявлениями экстремизма и терроризма под нацистской символикой*"[4]. Фактычна толькі з гэтага кніжнага выдання можна даведацца ў чым абвінавачваюцца Анжэліка Борыс і іншыя актывісты Беларускага саюза палякаў, паколькі працэс над імі адбываецца ў закрытым фармаце, а тут мы даведваемся, што яны "осуществляли реализацию деструктивных идей, направленных на героизацию военных преступников, оправдание геноцида белорусского народа, возбуждение национальной и религиозной вражды и розни"[5].

Але, як намі і прагназавалася, заклік Лукашэнкі, агучаны 5 студзеня 2022 года на спецыяльнай нарадзе, прысвечанай Году гістарычнай памяці, да перагляду прынцыпова істотных для беларускага гістарычнага наратыва перыядаў Вялікага Княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай так і застаўся нерэалізаваным на практыцы. Гэтая тэма практычна адсутнічала ў дзяржаўных медыях у разгляданы перыяд (за выключэннем адзінага выпуску ютуб-канала Вадзіма Гігіна з крытыкай рэвізіяніcцкага "літвінізму"). Зноў жа, прынцыповае пытанне ў тым, што інтэлектуальныя рэсурсы для дзяржаўнай гістарычнай палітыкі вельмі абмежаваныя, таму даводзіцца трымацца генеральных ліній, дзе зараз без усялякіх пытанняў пануе пытанне генацыду беларускага народа.

Нават амбіцыйны праект па стварэнню новага падручніка па гісторыі беларускай дзяржавы, які быў шырока разрэкламаваны Ігарам Марзалюком як новы ключавы тэкст, якім будуць зададзеныя прынцыповыя каардынаты для інтэрпрэтацыі беларускай гісторыі, "завіснуў" на этапе рэцэнзавання ў Інстытуце гісторыі Акадэміі навук. Ужо нават у гэтай дзяржаўнай інстытуцыі ўспрыняцце новага падручніка апынулася радыкальна негатыўным, што сведчыць пра вельмі абмежаваныя магчымасці для яго рэальнага ўздзеяння на поле гістарычнай адукацыі, а тым больш гістарыяграфіі.

Такім чынам, нават пачатак расійскай вайсковай агрэсіі не прывёў да нейкіх кардынальных зменаў у беларускай гістарычнай палітыцы, што істотна, тут не заўважна нейкага значнага зруху да актуалізацыі украінскай тэматыкі. Заўважна, што адбылася своеасаблівая крышталізацыя асноўных актараў беларускай гістарычнай палітыкі: у якасці галоўнага спікера безумоўную дамінуючую пазіцыю заняў Вадзім Гігін (адціснуўшы Марзалюка і Даніловіча), а распрацоўка тэмы генацыда беларускага народа неймаверна прыўзняла сімвалічны статус Генеральнай пракуратуры (якая ўжо скарыстала ўмацаванне сваіх пазіцый у змаганні са сваімі канкурэнтамі з Міністэрства ўнутраных справаў). Але пры гэтым застаюцца ключавыя праблемы: абмежаванасць распрацоўваемых тэмаў, адсутнасць інтэлектуальных рэсурсаў, што ставіць межы і для патэнцыялу палітычнай мабілізацыі.

У якасці своеасаблівага пазітыву трэба лічыць зварот да больш сістэматычнай працы з гістарычным мінулым недзяржаўных СМІ, застаецца толькі спадзявацца, што гэта тэндэнцыя ўтрымаецца.

---

[4] Геноцид белорусского народа. Под общей редакцией А. Шведа. – Минск: Беларусь, 2022. – С. 138.

[5] Там жа. С. 166.